

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*А. М. НАРОЎСКАЯ*

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ МУЗЕЯЛОГІІ

*Аналізуюцца публікацыі даследчыкаў, прысвечаныя тэарэтычным палажэнням аб музеі і фіксацыі іх у тэрмінах і паняццях, асноўныя тэндэнцыі развіцця музеяў у другой палове XX ст. Абазначаны новыя навуковыя катэгорыі, выпрацаваныя гісторыкамі музейнай справы, функцыі музея як сацыякультурнага інстытута і праблема феномена пазамузейнага збіральніцтва, разглядаюцца пытанні інтэграцыі музеяў разнастайных відаў і профіляў і стварэння адзінай музейнай інфармацыйнай прасторы.*

У канцы XIX ст. доктар J.Grasse ўпершыню ўводзіць ва ўжытак тэрмін “музеялогія”. У артыкуле “Музеялогія як навука” (Дрэздэн, 1883) ён вызначае даследчы патэнцыял гэтай галіны ведаў і робіць захады сцвердзіць яе як новую навуковую дысцыпліну.

На працягу XIX – XX стст. друкуюцца шэраг публікацый, у якіх аўтары спрабуюць сфармуляваць тэарэтычныя палажэнні аб музеі. Але нават у XX ст. не была вырашана асноўная праблема: музеялогія – гэта навука ці толькі сукупнасць блокаў інфармацыі, якая звязана з дзейнасцю музеяў? Можа, таму расійскія даследчыкі пішуць, што ў пачатку XXI ст. музеялогія як навуковая дысцыпліна знаходзіцца ў стадыі развіцця.

Шэраг музеязнаўцаў не прызнаюць увогуле музеялогію навукай. Так, амерыканскі даследчык W.Berns лічыць, што музеялогія займаецца толькі вывучэннем і класіфікацыяй музейных прадметаў і музейных калекцый. З пункту гледжання даследчыка з Усходняй Еўропы I.Neustupny, у музеязнаўства няма свайго спецыфічнага прадмета і метаду, што не дазваляе лічыць яго навуковай дысцыплінай [1, с. 19].

У 1960 – 1980 гг. праводзяцца міжнародныя канферэнцыі і дыскусіі па пытаннях прызнання музеялогіі самастойнай навуковай дысцыплінай. У выніку даследчыкі з СССР, шэрага еўрапейскіх краін робяць значны ўклад у структураванне музеязнаўства як навукі і распрацоўку асноўных паняццяў. У сумесным савецка-нямецкім выданні “Музееведение. Музеи исторического профиля” (1988) робіцца спроба сістэматызаваць асновы музеязнаўства. Сярод замежных музеязнаўцаў можна выдзеліць J.Benes, A.Gregorova, Z.Stransky (ЧССР), W.Herbst, J.Ave, K.Schreiner (ГДР), W.Glusinsky, K.Malinowsky (Польшча) і інш. [2, с. 10–12].

Нягледзячы на тое, што на Захадзе ў другой палове XX ст. дамінаваў эмпірычны падыход да музеялогіі, развіваліся і тэарэтычныя даследаванні. Найбольшым плёнам вызначаліся працы E.P.Alexander (ЗША), P.Mensch (Нідэрланды), Y.Sofka (Швецыя), B.Delose (Францыя) і інш. Сусветную вядомасць атрымалі даследаванні K.Hudson, які прааналізаваў узаемадзеянне музея і грамадства, ролю музея ў сучасным свеце, распрацоўкі тэорыі музейнай камунікацыі канадскага навукоўца D.F.Kameron, публікацыі французскага музеёлага G.H.Riviere па тэарэтычным абгрунтаванні экамузеялогіі.

У 1983 г. на Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у Лондане афармляецца ў якасці новага самастойнага напрамку “Новая музеялогія”. Асноўнымі яе ідэямі сталі інтэграцыя музея ў навакольнае асяроддзе і сацыялізацыя музея. У Заходняй Еўропе ўсё больш настойліва пачалі ставіцца патрабаванні да сучаснага музея: ён павінен не проста рэгістраваць мінулае, але выкарыстоўваць яго, уплываючы на сучаснае грамадства (канцэпцыі “музей-форум” D.F.Kameron, “музей без межаў”, музейная камунікацыя).

Аналіз літаратурных крыніц паказвае, што сёння тэрмін “музеялогія” ў большасці выпадкаў выкарыстоўваецца на Захадзе і ў ЗША, даследчыкі постсавецкай прасторы паранейшаму ўжываюць слова “музеязнаўства”. У энцыклапедычных слоўніках даецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

азначэнне, што музеязнаўства – навуковая дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем гісторыі музеяў, іх грамадскіх функцый, даследуе тэорыю і методыку музейнай справы.

Праблемы гэтай навукі пачынаюцца ўжо з самой назвы: тэрмін "музеязнаўства", па аналогіі з "мовазнаўствам", "мастацтвазнаўствам" ці іншымі лексічнымі ўтварэннямі такога тыпу, сведчыць аб тым, што прадметам музеязнаўчых ведаў павінен быць сам музей як канкрэтная культурная ўстанова. Нямецкі музеязнаўца K.Schreiner з гэтай нагоды піша, што "музеязнаўства не можа быць толькі навукай аб музеях, як медыцына не можа быць навукай аб бальніцах, а педагогіка – навукай аб школах".

Існуюць і іншыя праблемы ў музеялогіі. Гэта, у прыватнасці, адсутнасць агульнай канцэпцыі музея і як вынік – метадалагічнай асновы. Па-ранейшаму пераважае інстытуцыяльны падыход, прадстаўнікі якога бачаць у музеі навукова-даследчую, культурна-асветніцкую, адукацыйна-выхаваўчую ці рэкрэацыйную ўстанову. На працягу дзесяцігоддзяў музеі разглядаліся як канкрэтныя ўстановы, што выконваюць функцыі захавання і трансляцыі культуразначнай інфармацыі. Пры такім абмежаванні складана выйсці на агульныя заканамернасці, ацэнку значэння музея ў культуры, асэнсаванне музейнай справы як асобнай галіны культурнага жыцця і дзейнасці.

Вывучэнне пытанняў, прысвечаных тэарэтычным праблемам, паказала, што вялікая група фундаментальных музеязнаўчых паняццяў патрабуе пераасэнсавання. За апошнія дзесяцігоддзі адбыўся шэраг змен у поглядах на вызначэнне музеялогіі. Сёння яна як фарміруючая сацыяльна-гуманітарная дысцыпліна паступова ўваходзіць у парадыгму "памежжа", а менавіта плюралістычнага падыходу да культурна-гістарычнага аналізу і тэарэтыка-канцэптуальнай трактоўкі феноменаў культуры. Культуралагічны падыход дазволіў растлумачыць разнастайнасць гістарычных і сучасных формаў музейных устаноў і выдзеліць найбольш значныя этапы іх эвалюцыі, зрабіць акцэнт не столькі на канкрэтных фактах стварэння ці дзейнасці таго або іншага музея, колькі на аналізе і выяўленні ролі музеяў у культурным жыцці грамадства на пэўных этапах яго развіцця.

Такім чынам, на аснове дэтальнага аналізу працэсаў узнікнення і сацыяльнага бытавання музеяў сучасныя музеязнаўцы далі больш грунтоўную карціну зараджэння і развіцця музейнай навукі, яе паступовай трансфармацыі з прадметна арыентаванага музеязнаўства ў музеялогію як міждысцыплінарны кірунак.

Нягледзячы на тое, што гісторыя музейнай справы з'яўляецца базавым курсам для ўсіх музеязнаўчых спецыяльнасцей і лепш іншых раздзелаў музеязнаўчай навукі забяспечана фундаментальнымі даследаваннямі, яна амаль цалкам пазбаўлена свайго тэрміналагічнага апарату. Пры даследаваннях традыцыйна выкарыстоўваюцца метады і катэгорыі гістарычнай навукі, дапаможных гістарычных дысцыплін, мастацтвазнаўства, а ў апошнія галы – культуралогіі [3].

На самым пачатку XXI ст. з'явіліся работы, якія разглядаюць гісторыю музеяў у кантэксце вывучэння культурнага патэнцыялу грамадства. Музеязнаўцы пачалі ўжываць паняцце "культурная форма", якое ўжо атрымала апрабацыю. Разгляд музея як асобай культурнай формы, выпрацаванай чалавецтвам на пэўным этапе свайго развіцця, разглядаецца ў манаграфіі Т.Калугінай "Мастацкі музей як феномен культуры", дзе выкарыстоўваецца паняцце "культурная форма" і вызначаецца культуралагічны падыход да феномена мастацкага музея. Галоўны акцэнт робіцца на гістарычным шляху, які праходзяць музеі. Аб'ектам даследавання сталі не канкрэтныя музеі, а гісторыя культуры, на пэўным этапе развіцця якой з'яўляецца культурная форма "музей". Яна адаптуецца, развіваецца і набывае розныя мадыфікацыі. Выкарыстанне катэгорыі "культурная форма" дазволіла пазбегнуць апісальнасці і зрабіць спробу выйсці на агульныя заканамернасці развіцця музейнай справы.

Мноства відаў і тыпаў музеяў ускладняла іх сістэматызацыю і класіфікацыю і прыводзіла да дыскусій сярод прафесіяналаў. Асноўная складанасць была ў тым, што ў адзіным культурным працэсе неабходна было разглядаць развіццё шматлікіх і вельмі не падобных адна на другую музейных устаноў (напрыклад, музеі краязнаўчыя і мастацкія, геалагічныя і археалагічныя, ведамасныя і грамадскія і інш.). Выкарыстанне паняцця "культурная форма" дазволіла аддзяліць паняцце ад аб'екта ў яго канкрэтна-гістарычнай рэальнасці, але пры гэтым выдзеліць тое агульнае, што характэрна кожнаму з рэальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурных аб’ектаў і такім чынам растлумачыць шматграннасць гістарычных і існуючых формаў музейных устаноў.

Метадалагічнае значэнне катэгорыі “культурная форма” для гістарычных даследаванняў з’яўляецца перспектыўным. Гэта паняцце можа быць выкарыстана для структуравання і інтэрпрэтацыі ўжо ўстаноўленых навукай фактаў.

Сёння адным з кірункаў тэрміналагічных даследаванняў музеёлагаў з’яўляецца працэс надання статусу навуковай катэгорыі паняццям, якія шырока выкарыстоўваюцца ў музеязнаўчай літаратуры, напрыклад “пратамузейная ўстанова”. Даследчыкі выявілі агульныя рысы і агульныя тэндэнцыі развіцця вялікай групы на першы погляд разнародных і ніяк не звязаных паміж сабой культурных утварэнняў, якія з’явіліся на ранніх этапах гісторыі культуры: кніжных манастырскіх збораў, аптэк, арсеналаў, княжацкіх скарбніц, звярынцаў і інш. Пастаноўка праблемы феномена пазамузейнага збіральніцтва вызначыла цэлую праграму навуковых даследаванняў.

Такім чынам, актуальнымі задачамі музеёлагаў з’яўляюцца тэарэтычнае асэнсаванне дасягненняў апошніх дзесяцігоддзяў і фіксацыя іх у катэгорыях і тэрмінах. Удакладненне існуючых тэрмінаў і паняццяў, увядзенне гісторыкамі музейнай справы новых навуковых катэгорый – усё гэта будзе садзейнічаць пераадоленню апісальнасці, якая характэрна для многіх гістарычных даследаванняў.

Працэсы дыферэнцыяцыі і інтэграцыі ведаў працякаюць з такой інтэнсіўнасцю, што без уліку гэтай праблемы таксама немагчыма будаваць навуковае развіццё музеялогіі. Дасягненні ў прыродазнаўчых і дакладных навуках, асэнсаванне ролі тэхнікі і інфармацыі ў сучасным свеце, фарміраванне комплексных міждысцыплінарных галін ведаў, паняццяў і падыходаў прывялі да сур’ёзнай перабудовы навуковай прасторы.

Адной з праблем сучаснай музеялогіі з’яўляецца пераасэнсаванне тых тэндэнцый, якія з’яўляюцца вынікам развіцця музеяў у другой палове ХХ ст. і вызначаюць іх сучасны стан. На мяжы ХХ – ХХІ стст. традыцыйнае разуменне музея як захавальніка культурных каштоўнасцей значна трансфарміравалася, што звязана са зменамі, якія адбыліся ў музейнай практыцы. Узнікненне музеяў новага тыпу (экамузеяў, дзіцячых музеяў, музеяў – культурных цэнтраў) пашырыла іх функцыі. У выніку былі распрацаваны праграмы, якія дазволілі павялічыць уплыў музеяў на сацыяльны кантынгент [4, с. 110–111].

З’явіліся музейна-педагагічныя праграмы, гульні для школьнікаў, студыі і майстэрні, распрацоўкі для розных катэгорый наведвальнікаў. Усё гэта патрабуе тэарэтычных даследаванняў, якія дазволяць прааналізаваць новыя рэальнасці музейнай практыкі. У ХХ ст. атрымаў шырокае развіццё новы тып музея – музей пад адкрытым небам, што прывяло да ўзнікнення новага кірунку ў музеялогіі – скансэналогіі.

У выніку ў канцы ХХ ст. узнікае тэндэнцыя перагляду вызначэння музейнага прадмета, што было звязана з актыўным уключэннем у сферу музейнай дзейнасці нерухомых гісторыка-культурных і нематэрыяльных аб’ектаў.

З’яўленне эксперыментальных музейных устаноў, сфера дзейнасці якіх выйшла за межы камплектавання, вывучэння, кансервацыі і экспанавання фондаў, была выклікана да жыцця не толькі пошукамі шляхоў аднаўлення традыцыйнага музея, але і паглыбленнем паняцця “культурная спадчына”. У сучасным музеязнаўстве ўсё больш распаўсюджваецца погляд на музей і культурную спадчыну як на важнейшы рэсурс развіцця горада, рэгіёну, краіны.

Вынікам інтэграцыі музеяў і соцыуму з’яўляецца ўзрастанне ролі адукацыйнай функцыі музея. Статыстычныя даныя паказваюць колькасны рост наведвальнікаў музеяў ва ўсім свеце, але для музеязнаўства значна больш важныя якасныя змены мадэлей узаемаадносін паміж музеем і яго аўдыторыяй. Музейна-педагагічныя даследаванні накіраваны на цэласнае асэнсаванне ўзаемадзеяння музея з наведвальнікам з улікам псіхалагічных, сацыялагічных і культуралагічных складаючых. Распрацоўваюцца праграмы і праекты, якія прадугледжваюць самастойнае азнаямленне з экспазіцыямі музеяў, ствараюцца інтэрактыўныя экспазіцыі.

Прыярытэтнай аўдыторыяй сучаснага музея любога віду і профілю з’яўляюцца дзеці ўсіх узростаў. Развіццё дзіцячага кірунку ў музейнай педагогіцы прывяло да стварэння асобага тыпу музея – дзіцячага музея. Усе разнавіднасці дзіцячых музеяў арыентаваны на шматканальную і рознаўзроўневую інтэграцыю гэтых устаноў у соцыум.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікам пошуку і развіцця новых формаў узаемадзеяння музея і грамадства з’яўляюцца ўзнікненне і дзейнасць экамузеяў. Яны ствараюцца перш за ўсё для мясцовага насельніцтва. Рэсурсам развіцця экамузеяў з’яўляецца сацыяльнае жаданне жыхароў канкрэтнай лакальнай тэрыторыі і іх зацікаўленасць у захаванні унікальнай спецыфікі дадзенай мясцовасці.

Другая важная тэндэнцыя характарызуецца інтэграцыяй музеяў разнастайных відаў і профіляў і стварэннем адзінай музейнай прасторы. Тэндэнцыя да аб’яднання музеяў акрэслілася ўжо даўно. Яна цесна звязана з тэндэнцыяй росту міжмузейнай інфармацыйнай прасторы. Пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гг. адбываецца паступовае пранікненне інтэрнет-тэхналогій у музейную справу, што прыводзіць да ўзнікнення віртуальных музеяў і аб’яднаных онлайнавых музейных супольнасцей. Пры гэтым многія з іх пабудаваны на прынцыпах інтэрактыўнасці і дынамічнага аднаўлення інфармацыі, што стварае магчымасці для камунікацыі.

Нядаўна з’явіўся новы тып музейных інфармацыйных паслуг, ствараемых на аснове праграм трохмернай графікі. Выкарыстанне такіх праграм найбольш эфектыўна там, дзе аб’ектам інтэрпрэтацыі з’яўляюцца архітэктурны будынак, яго часткі – у музеях-запаведніках, музеях пад адкрытым небам і ў музеях, размешчаных у помніках архітэктуры [5].

Атрыманая 3D-мадэль прымяняецца ў працэсе правядзення рэстаўрацыйных работ (падбор колеру матэрыялаў) і ў экспазіцыйнай дзейнасці музеяў (віртуальныя расстаноўка мэблі і развешванне карцін). Мадэль можа быць выкарыстана пры стварэнні інфармацыйнай сістэмы для наведвальнікаў.

Такім чынам, вывучэнне пытанняў, прысвечаных тэарэтычным праблемам, паказала, што вялікая група фундаментальных музеязнаўчых паняццяў патрабуе пераасэнсавання. Адным з самых складаных аспектаў у музеялогіі з’яўляецца ўвядзенне у навуковы ўжытак новых тэрмінаў, у тым ліку запазычаных з сумежных дысцыплін. Існуюе і такая праблема ў музеялогіі, як адсутнасць агульнай канцэпцыі музея і як вынік – метадалагічнай. Важнай праблемай сучаснай музеялогіі з’яўляецца пераасэнсаванне тых тэндэнцый, якія ўзніклі ў выніку развіцця музеяў у другой палове XX ст. Гэта стварэнне музеяў новага тыпу: экамузеяў, музеяў пад адкрытым небам, музеяў – культурных цэнтраў, што пашырае функцыі музеяў. У выніку распрацаваны праграмы, якія павялічылі ўплыў музеяў на соцыум. Працэсы дыферэнцыяцыі і інтэграцыі ведаў працякаюць сёння з такой інтэнсіўнасцю, што без уліку гэтай праблемы таксама немагчыма будаваць навуковае развіццё музеялогіі. Вызначальнай з’яўляецца і тэндэнцыя, якая характарызуецца інтэграцыяй музеяў разнастайных відаў і профіляў, што вядзе да стварэння адзінай музейнай і інфармацыйнай прасторы.


1. *Основы* музееведения: учеб. пособие / отв. ред. Э.А.Шулепова. – М.: Едиториал УРСС, 2005. – С. 19.

2. *Музееведение.* Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов по спец. “история” / под ред. К.Г.Левыкина, В.Хербста. – М.: Высш. шк., 1988. – С. 10–12.

3. *Сундиева, А.А.* Профессиональный язык музейного сообщества: научные перспективы терминологич. исследований / А.А.Сундиева // Материалы Междунар. науч.-практ. конференции [Электрон. ресурс]. – М., 2006. – Режим доступа: http://tatar.museum.ru. – Дата доступа 10.01.2008.

4. *Музеі* і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы // Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канферэнцыі, Мінск – Полацк, 8–11 красавіка 2002 г. – Мн., 2002. – С. 110–111.

5. *Музей* будущего: информационные технологии и культурное наследие [Электрон. ресурс]. – М., 2000. – Режим доступа: http://www/future.museum.ru. – Дата доступа 27.01.2008.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ